шк. узросту / У. Марук. – Мн. : Маст. літ., 2003.
4. Пісьмянкоў А. Мы з братам : вершы, казкі : для дашк. узросту / А. Пісьмянкоў. – Мн. : Маст. літ., 2003.
5. Паўлаў У. Згадка на дабро : вершы, забаўлянкі-пазнаванкі, загадкі, паэма-казка : для малод. шк. узросту / У. Паўлаў. – Мн. : Маст. літ., 2004.
6. Лукша В. Адзіны ў свеце край : вершы і казкі : для малод. шк. узросту / В. Лукша. – Мн. : Маст. літ., 2004.
7. Жук К. Бегемот без ботаў : Вершы. Загадкі. Скорагаворкі. Казка : для дашк. узросту / К. Жук. – Мн. : Маст. літ., 2004.
8. Каско А. Два сонцы : вершы, вымаўлянкі, казкі : для малод. шк. узросту / А. Каско. – Мн. : Маст. літ., 2004.
9. Данільчык А. Павуцінка на агрэсце : вершы : для сярэд. шк. узросту / А. Данільчык. – Мн. : Маст. літ., 2005.

# БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ЛІТАРАТУРА Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ МУЗЫКАНТАЎ

***Кузьмініч Мікалай Леанідавіч****, кандыдат педагагічных навук, першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

У сістэме падрыхтоўкі музыкантаў шырока выкарыстоўваецца разнастайная літаратура вучэбнага і вучэбна-метадычнага, навуковага і навукова-метадычнага, даведачнага і папулярнага зместу, а таксама хрэстаматыі, нотныя зборнікі, школы і інш. Уся гэтая друкаваная прадукцыя ў педагогіцы адносіцца да сродкаў навучання, якія з’яўляюцца важнейшым кампанентам педагагічнага працэсу. Ад колькасці і якасці шмат у чым залежыць яго эфектыўнасць. У савецкі перыяд беларускія навучальныя ўстановы сферы культуры і мастацтва пераважна выкарыстоўвалі друкаваныя сродкі навучання, падрыхтаваныя расійскімі навукоўцамі і выдадзеныя ў расійскіх выдавецтвах. Ва ўмовах пабудовы нацыянальнай сістэмы музычнай адукацыі ўзнікла неабходнасць прааналізаваць забяспечанасць музычна-адукацыйнага працэсу друкаванай прадукцыяй “айчыннай вытворчасці”, высветліць яе месца сярод сродкаў музычна- педагагічнага працэсу.

Сродкі навучання (СН) – гэта “усе аб’екты і працэсы (матэрыяльныя і матэрыялізаваныя), якія служаць крыніцай навучальнай інфармацыі і інструментамі (уласна сродкамі) для засваення зместу навучальнага матэрыялу, развіцця і выхавання навучэнцаў”. А сістэма сродкаў навучання – гэта “сукупнасць аб’ектаў, неабходных і дастатковых для рэалізацыі працэсу навучання ў дыдактычным цыкле (на ўроку, у ланцужку іх, а таксама і па-за ўрокамі)” [1]. Элементы сістэмы СН – гэта крыніцы навучальнай інфармацыі ці сродкі-інструменты, якія дапамагаюць навучэнцам засвоіць навучальнны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыял і інтэнсіфікаваць працу вучня і педагога. У сістэме СН вылучаюць чатыры элементы [2]: 1) слова настаўніка, 2) кніга (падручнік з вучэбным кніжным камплектам), 3) сродкі нагляднасці (у т.л. прадметныя), 4) тэхнічныя сродкі навучання.

Такім чынам, да сродкаў музычнага навучання ў вузкім сэнсе мы адносім аб'екты, якія выступаюць у якасці інструментаў вырашэння педагагічных задач: слова педагога, друкаваныя сродкі навучання (падручнікі, дапаможнікі, хрэстаматыі, зборнікі рэпертуара і інструктыўнага матэрыяла), прадметныя сродкі навучання (музычныя інструменты, пульты, падстаўкі, камертон, стэнды, плакаты, мадэлі і іншае абсталяванне вучэбных аўдыторый для музычных заняткаў), тэхнічныя сродкі навучання (аўдыавізуальныя, камп'ютэры, кабінеты праграмаванага навучання, фанакабінеты, аўтаматызаваныя навучальныя сістэмы і інш.). Сістэмаўтваральным элементам сістэмы сродкаў навучання выступае змест адукацыі, які вызначае і спосаб яго засваення на ўзроўні вучэбнага матэрыялу і педагагічнай рэчаіснасці.

Функцыі элементаў сістэмы сродкаў навучання па-рознаму праяўляюцца ў залежнасці ад пэўных вучэбных прадметаў. Роля слова педагога павышаецца пры вывучэнні прадметаў, дзе дамінуюць тэарэтычныя веды і, наадварот, памяншаецца там, дзе фармуюцца практычныя навыкі, эстэтычныя адносіны да рэчаіснасці. На музычных прадметах першасным сродкам ўспрымання навучальнага матэрыялу становяцца самі музычныя творы, якія і выступаюць крыніцай інфармацыі і цэласнага ўспрымання вобразу. Цэнтральная функцыя падручніка – інфармаванне, а таксама кіраванне навучальнай дзейнасцю, інтэграцыя і каардынацыя, развіццё і выхаванне. Пры гэтым інфармацыйную функцыю ў найбольшай ступені рэалізуюць падручнікі па прадметах, дзе дамінуюць тэарэтычныя веды. У меншай ступені – дзе засвойваюцца спосабы дзейнасці, для якіх асноўнымі крыніцамі інфармацыі з'яўляюцца першакрыніцы – музычныя творы. Функцыя кіравання падручнікаў больш рэалізуецца на прадметах, дзе дамінуе вывучэнне спосабаў дзейнасці і менш за ўсё – на прадметах, звязаных са спазнавальнай дзейнасцю навучэнцаў, іх маральна-эстэтычным выхаваннем навучэнцаў, прадметах эстэтычнага цыклу. Падручнік павінен рэалізоўваць і функцыю саманавучання і самакантролю, г.зн. павінен забяспечыць засваенне навучальнага матэрыялу без дапамогі педагога. Сродкі нагляднасці выкарыстоўваюцца для раскрыцця вучэбнага матэрыялу. Нагляднасць сродкаў навучання рэалізуецца на ўсіх прадметах, але ў рознай ступені.

У педагагічнай літаратуры падручнік часта разглядаецца ў комплексе з іншымі сродкамі [3]. Навучальны кніжны камплект можа ўключаць, напрыклад, кнігі для самастойнай работы па засваенні праграмнага матэрыялу – зборнікі задач, практыкаванняў, хрэстаматыі, зборнікі дакументаў і інш. Навучальны камплект на друкаванай аснове часам уключае дапаможнікі не толькі для вучня, але і для педагога. Такі камплект называюць вучэбна-метадычным. Падруч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нік павінен цесна спалучацца, адпавядаць вуснаму слову педагога, а сродкі нагляднасці павінны цалкам адпавядаць дэманстрацыйна-наглядному комплексу, прадстаўленаму ў падручніку; комплекс ТСН таксама падбіраюць пад падручнік. У прадметах эстэтычнага цыкла музычныя творы з'яўляюцца асноўнай крыніцай інфармацыі, і іх не можа замяніць ні слова педагога, ні падручнік, ні сродкі нагляднасці, ні ТСН. Музычныя творы, якія выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе, збіраюцца ў нотных зборніках, хрэстаматыях і фанахрэстаматыях, у дадатках да школ і з'яўляюцца важнейшай часткай вучэбнага камплекта на друкаванай аснове – вучэбна-метадычнага комплекса.

Выкарыстанне разнастайных сродкаў у навучальным працэсе пры выкладанні музычных прадметаў заўсёды знаходзіліся ў цэнтры ўвагі педагогаў. Яно звязвалася з імкненнем павысіць нагляднасць навучання, дабіцца больш трывалага засваення ведаў, паскорыць тэмп навучання, спрасціць працу педагога і навучэнцаў, істотна актывізаваць і рацыяналізаваць вучэбны працэс, выкарыстоўваць больш прадуктыўныя метады навучання, павысіць эфектыўнасць педагагічнай працы. Музычныя педагогі назапасілі вопыт стварэння комплексаў ТС музычнага навучання, якія дапамагаюць у вырашэнні разнастайных дыдактычных задач – зберажэння і падачы інфармацыі, актывізацыі ўспрымання, здзяйснення аперацыянальнай дзейнасці, карэкцыі, трэнажу, кантролю і інш. У той самы час друкаваныя сродкі музычнага навучання не страцілі свайго значэння. Яны шырока выкарыстоўваюцца на занятках па музычна-гістарычных і музычна-тэарэтычных прадметах, а ноты – на практычных занятках.

У якасці асноўнага метаду, які дазваляе высветліць забяспечанасцы навучальнага працэсу друкаванымі сродкамі, мы выкарыстоўвалі бібліяметрычны аналіз дакументнага патоку музычна-адукацыйнай тэматыкі. Даследаванні былі здзейснены на падставе крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі за 2001–2003 гг. – Летапісу друку Беларусі (кніжны летапіс, летапісы аўтарэфератаў дысертацый, нарматыўна-тэхнічных дакументаў і выданняў вузкага прызначэння, нотаў), Летапісу часопісных артыкулаў, Летапісу газетных артыкулаў. Вынікі бібліяметрычнага аналізу прадстаўлены ў табліцах 1–4.

Дадзеныя табліцы 1 сведчаць аб тым, што ў музычна- педагагічнай практыцы могуць выкарыстоўвацца разнастайныя віды друкаванай прадукцыі: 1) музычныя творы, якія прадстаўлены ў нотных зборніках, часопісных і газетных выданнях; 2) навучальна-метадычныя выданні для розных ступеняў агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі; 3) навуковыя выданні (манаграфіі, дысертацыі, зборнікі навуковых артыкулаў, матэрыялы навуковых канферэнцый), папулярная літаратура музычнага зместу, а таксама газетныя і часопісныя артыкулы, якія маюць вучэбна-метадычны, навуковы ці папулярны змест.

У часопісах і газетах пераважна друкуюцца ноты для музыкантаў-аматараў. Звычайна гэта папулярныя песні, якія могуць выкары-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стоўвацца ва ўстановах агульнай музычнай адукацыі, у аматарскім музіцыраванні. Шэраг нотных зборнікаў мае дакладнага адрасата – школьныя хоры, музычныя школы і музычныя калектывы, салісты. Вучэбна-метадычныя выданні, як правіла, адрасуюцца пэўным навучальным установам, у некаторых выпадках – адначасова ўстановам розных узроўняў адукацыі. Сярод іх дапаможнікі, навучальныя праграмы, літаратурна-музычныя сцэнары і хрэстаматыі, школы, метадычныя рэкамендацыі і ўказанні і інш. Навуковыя выданні прадстаўлены манаграфіямі даследчыкаў музычнага мастацтва і музычнай адукацыі, а таксама доктарскімі і кандыдацкімі дысертацыямі па музыказнаўстве, педагагічных навуках і філасофіі. Папулярныя выданні прызначаны для шырокага кола чытачоў, якія цікавяцца музычным мастацтвам і імкнуцца да пашырэння сваіх ведаў у названай галіне і музычнай педагогіцы.

Газетныя публікацыі (гл. табліцы 1, 3) носяць, як правіла, папулярны характар. Колькасць газет па гадах і колькасць штомесячных публікацый на працягу 2001–2003 гг. застаецца стабільнай: штомесяц 100–150 публікацый музычнай тэматыкі сустракаюцца на старонках ста з невялікім газет. Самымі "музычнымі" можна лічыць "Музыкальную газету", "Белорусскую деловую газету", "Культуру", "Знамя Юности". Адначасова кожная трэцяя са ста ўлічаных газет на працягу года друкуе толькі 1 – 2 артыкула музычнай тэматыкі.

Часопісныя публікацыі (гл. табліцы 1, 2) больш разнастайныя па сваім змесце. Яны маюць не толькі папулярную, асветніцкую накіраванасць, але і навуковую, навукова-метадычную, а таксама вучэбна-метадычную. Артыкулы пераважна навуковай і навуковаметадычнай скіраванасці змешчаны ў "Весніку БДАМ", "Мастацтве", вучэбна-метадычнай – у часопісах "Асновы мастацтва", "Роднае слова". Артыкулы папулярнага зместу сустракаюцца на старонках "Джаз-квадрата", "Беларусі" і інш. Безумоўным лідэрам па колькасці публікацый музычнай тэматыкі з'яўляецца "Джаз-квадрат". Пачынаючы з 2003 г. да яго далучыўся часопіс "Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання", на старонках якога можна сустрэць карысныя для навукоўцаў, метадыстаў і музыкантаў-практыкаў матэрыялы.

Сапраўднымі навукова-метадычнымі цэнтрамі ў галіне музычнай адукацыі можна лічыць вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны – БДУ культуры і мастацтваў, БДА музыкі, БДПУ імя М. Танка (музычна-педагагічны факультэт), а таксама Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры (факультэт павышэння кваліфікацыі), рэгіянальныя універсітэты, дзе плённа працуюць кафедры музычна-педагагічнай падрыхтоўкі. Выкладчыкі-музыканты названых устаноў штогод выдаюць вялікую колькасць вучэбна-метадычнай, навуковай, нотнай літаратуры, якая шырока выкарыстоўваецца не толькі ў ВНУ, але і ва ўстановах пачатковай і сярэдняй спецыяльнай музычнай адукацыі, у калектывах мастацкай самадзейнасці і аматарскай творчасці, у дашкольных установах і ўстановах пазашколь-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най адукацыі.

Прадстаўленыя ў табліцы № 5 даныя характарызуюць дакументны паток музычна-адукацыйнай тэматыкі за 2001–2005 гг., які быў апрацаваны супрацоўнікамі рэдакцыйна-выдавецкага аддзела БДУ культуры і мастацтваў і выдадзены на універсітэцкай базе. Трэба дадаць, што вялікая колькасць публікацый была зроблена педагогамі за межамі універсітэта – у іншых выдавецтвах краіны. Тым не менш і прыведзеныя ў табліцы № 5 лічбы (усяго 83 дакументы адпаведнай тэматыкі) сведчаць аб інтэнсіўнай рабоце ВНУ па забеспячэнні музычна-адукацыйнай сістэмы краіны неабходнымі друкаванымі сродкамі навучання.

**_Табліца 1._**

*Дакументны паток музычна-адукацыйнай скіраванасці (2001–2003 гг.)*

| Год | Нотныя зборнікі | Часопісы і газеты, у якіх апуб. ноты | Вучэбна-метадычныя выданні для | | | | Навуковыя выданні | Дысертацыі | | Папулярныя | Часопісы | | Газеты | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Д | Ш | С | ВНУ | | Докт. | Канд. | | К-ць часоп. | К-ць публ. | К-ць газет. | К-ць публ. |
| 01 | 28 | 45/184 | 2 | 20 | 7 | 15 | 1 | 1 | 5 | 2 | 33 | 193 | 101 | 1428 |
| 02 | 6 | 33/455 | 4 | 6 | 7 | 21 | 11 | - | 2 | 7 | 38 | 189 | 101 | 1506 |
| 03 | 58 | 48/623 | 2 | 12 | 8 | 31 | 18 | 3 | 5 | 13 | 47 | 277 | 92 | 1408 |
| Усяго | 92 | 48/1262 | 8 | 38 | 22 | 67 | 30 | 4 | 12 | 22 | 118 | 659 | 294 | 4342 |

**_Табліца № 2._**

*Часопісныя артыкулы музычна-адукацыйнай тэматыкі (2001–2003 гг.)*

| Назва часопіса | | Год | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2001 | 2002 | 2003 |
| 1. | Arche | | - | 1 | 1 |
| 2. | Автомир | | - | - | 1 |
| 3. | Адукацыя і вых. | | - | 1 | - |
| 4. | Акно | | - | - | 1 |
| 5. | Алеся | | 6 | 8 | 7 |
| 6. | Америк. исслед. | | - | - | 1 |
| 7. | Армия | | - | 3 | 3 |
| 8. | Архіварыус | | 1 | - | - |
| 9. | Асновы мастацтва | 5 | 6 | - | |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 10. | Belarus and busines- | - | 1 | |
| 11. | Бел. гіст. часопіс | - | - | 3 |
| 12. | Бел.думка | - | 4 | 7 |
| 13. | Беларусь | 6 | 9 | 4 |
| 14. | Беларусь в мире | - | - | 1 |
| 15. | Бібліятэка прапануе | - | - | 1 |
| 16. | Веснік БДАМ | 18 | 16 | 44 |
| 17. | Веснік БДПУ | 2 | - | 4 |
| 18. | Веснік БДУ | - | - | 1 |
| 19. | Веснік БДУ культуры | - | - | 2 |
| 20. | Веснік БрДУ | 1 | 1 | - |
| 21. | Веснік ВДУ | 2 | | 4 |
| 22. | Веснік ГрДзУ | - | 1 | 2 |
| 23. | Веснік МгГУ | - | 1 | - |
| 24. | Веснік НАН Беларусі | 1 | - | - |
| 25. | Вести ин-та совр. знаний | 1 | - | - |
| 26. | Вожык | - | - | 1 |
| 27. | Вышэйшая школа | 1 | - | 5 |
| 28. | Гаспадыня | 1 | - | 1 |
| 29. | XXI век | - | 1 | 3 |
| 30. | Дело | 1 | - | - |
| 31. | Джаз-квадрат | 79 | 63 | 38 |
| 32. | Директор | 1 | 1 | - |
| 33. | Дыялог | 1 | 1 | 2 |
| 34. | Женский ж-л | 1 | 9 | - |
| 35. | Здоровье и успех | - | 3 | 7 |
| 36. | Изв. бел. інж. академии | - | - | 1 |
| 37. | Кантакты і дыялогі | - | 1 | 1 |
| 38. | Кіраванне ў адукацыі | - | - | 1 |
| 39. | Корвет | 3 | - | - |
| 40. | Край | - | 1 | - |
| 41. | Крыніца | - | - | 2 |
| 42. | Культура бел. пагранічча | 1 | - | - |
| 43. | Магіл. даўніна | - | 1 | - |
| 44. | Маладосць | 3 | - | - |
| 45. | Мастацкая адукацыя і культура | - | - | 2 |
| 46. | Мастацтва | 17 | 9 | 23 |
| 47. | Мишпоха | - | 1 | - |
| 48. | Мінская школа | - | 1 | 4 |
| 49. | Муз. и тэатр. мастацтва: праблемы выкладання | - | - | 52 |
| 50. | Музыкальный журнал | 8 | 6 | - |
| 51. | На экранах | - | - | 1 |
| 52. | Надежда для тебя | - | - | 1 |
| 53. | Народная асвета | 1 | 4 | 2 |
| 54. | Наша вера | - | - | 2 |
| 55. | Неман | 2 | 1 | - |
| 56. | Пазашк. вых. | - | 3 | 4 |
| 57. | Пачатк. школа | - | 4 | - |
| 58. | Педагогика эст. среды | - | 1 | - |
| 59. | Першацвет | 13 | 3 | - |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 60. | Планета-семья | - | 1 | - |
| 61. | Полымя | 2 | 2 | - |
| 62. | Пралеска | 1 | 1 | 11 |
| 63. | Роднае слова | 8 | 9 | 14 |
| 64. | Русский язык и литература | - | - | 2 |
| 65. | 168 часов Минска | 1 | - | - |
| 66. | Служба спасения | - | - | 2 |
| 67. | Соц. и социокульт. процессы | - | - | 1 |
| 68. | Спадчына | - | 1 | - |
| 69. | Студэнцкая думка | 5 | 6 | 4 |
| 70. | Ступени | - | - | 1 |
| 71. | Футбол | - | - | 1 |
| 72. | Целитель | 1 | - | - |
| УСЯГО | | 32/193 | 38/189 | 42/277 |

***Табліца №3.***

*Газетныя артыкулы музычна-адукацыйнай тэматыкі (2001–2003 гг.)*

| Назва газеты | Размеркаванне газетных артыкулаў па гадах | | |
|---|---|---|---|
| | 2001 | 2002 | 2003 |
| Авив | 3 | 6 | 9 |
| Автобизнес | 1 | - | 1 |
| Анахну кан | - | - | 1 |
| Аргументы и факты в Бел. | 6 | 7 | 2 |
| Афродита | 3 | 3 | - |
| Belarus Today | 6 | 4 | 17 |
| БДГ | 66 | 64 | 52 |
| Бел. рынак | 1 | 1 | 6 |
| Беларусачка | 1 | - | - |
| Беларуская газета | 7 | 15 | 34 |
| Беларуская маладзёжная 31 | 29 | - | |
| Беларуская ніва | 9 | 19 | 14 |
| Беларускі час | 6 | 4 | 16 |
| Белорус. лесная газета | - | - | 2 |
| Берега | 2 | 4 | 3 |
| Биржа информ | 4 | 9 | 8 |
| Брестский курьер | 9 | 4 | 3 |
| В свободный вечер | - | 1 | - |
| Варшаўскі мост | 13 | - | - |
| Вдохновение | 1 | - | 3 |
| Веды | 2 | - | 1 |
| Вестник Могилёва | 15 | 27 | 19 |
| Вечерний Витебск | 7 | 6 | 2 |
| Вечерний Гомель | 4 | 5 | 4 |
| Вечерний Гродно | 6 | 3 | 2 |
| Витебские деловые новости | 2 | - | - |
| Витебский рабочий | 10 | 6 | 10 |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Віцьбічы | 7 | 7 | 11 |
| Во славу Родины | 23 | 25 | 12 |
| Воскр. газета | - | 1 | - |
| Воскресение | 1 | 2 | 1 |
| Вячэрні Брэст | 16 | 23 | 13 |
| Вячэрні Мінск | 42 | 25 | 43 |
| Glos znad Nemna | 18 | 19 | 16 |
| Гастроном | 36 | 4 | - |
| Голас Радзімы | 15 | 8 | 24 |
| Гомельская праўда | 5 | 11 | 3 |
| Гомельские ведомости | 6 | 3 | 4 |
| Гражданская газета | 1 | - | - |
| Гродзенская праўда | 8 | 21 | 10 |
| Гродн. епарх. ведомости | - | 3 | 1 |
| Гродненская правда | 4 | - | 2 |
| Дачник | 1 | - | - |
| Деньги | - | 1 | - |
| Де-факто | 5 | 3 | - |
| Дзелавое Палессе | 4 | 2 | - |
| Дзень | 3 | 27 | - |
| Догадки и открытия | 1 | - | - |
| Дом и сад | 1 | 1 | 1 |
| ДТП | 1 | 4 | 2 |
| Дух. вестник | 1 | 1 | 1 |
| Женский калейдоскоп | 6 | 2 | 4 |
| Заря | 4 | 3 | 4 |
| Звязда | 24 | 13 | 43 |
| Згода | 14 | 3 | - |
| Знамя юности | 49 | 52 | 31 |
| Зямля і людзі | 17 | 12 | 6 |
| Інформ-прогулка | 1 | - | - |
| Книжный мир | 6 | 6 | - |
| Компьютерная Белоруссия | - | - | 2 |
| Компьютерная газета | - | - | 1 |
| Комсомольская правда в Бел. | 20 | 37 | 16 |
| Культура | 79 | 95 | 120 |
| ЛіМ | 24 | 20 | 35 |
| Любимая | 15 | 2 | - |
| Minsk times | - | - | 12 |
| Магілёўская праўда | 13 | 13 | 2 |
| Магілёўскія ведамасці | 35 | 41 | 28 |
| Маладзёжны праспект | 33 | 1 | 4 |
| Медицинский вестник | - | 1 | - |
| Местное время | - | - | 1 |
| Милицейские вести | 2 | 1 | - |
| Минский меридиан | 29 | 29 | 25 |
| Мінская праўда | 6 | 4 | 13 |
| Минский курьер | 1 | 24 | 24 |
| Музыка для всех | 19 | 9 | 5 |
| Музыкальная газета | 294 | 372 | 331 |
| Мы и время | - | - | 1 |
| На страже | 5 | 7 | 3 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Наблюдатель | - | 7 | 2 |
| Народнае слова | 10 | 5 | 8 |
| Народная воля | 4 | 8 | 24 |
| Народная газета | 19 | 18 | 34 |
| Народная трыбуна | 1 | 3 | 5 |
| Настаўніцкая газета | 5 | 3 | 3 |
| Нац.эконом.газета | - | 3 | 1 |
| Наша доля | 3 | 1 | 1 |
| Наша ніва | 23 | 13 | 17 |
| Наша свабода | 6 | 9 | - |
| Наша слова | 7 | 16 | 14 |
| Новы час | - | - | 11 |
| Обозреватель | - | 3 | 11 |
| Однако | 1 | 8 | 2 |
| Отдых и путешествия | - | 1 | 4 |
| Отдыхай | 30 | 24 | 14 |
| Пагоня | 6 | 1 | - |
| Переходный возраст | 24 | 29 | 15 |
| Полацк. епарх. ведомости | 1 | - | - |
| Полезная газета | 1 | 1 | - |
| Предпрнимательская газета | - | 1 | 1 |
| Преображение | 1 | - | - |
| Прессбол | - | 1 | 1 |
| Путешественник | 2 | 3 | 1 |
| Региональные ведомости | 1 | - | 1 |
| Рэспубліка | 21 | 16 | 33 |
| Салідарнасць | - | - | 1 |
| Свабодная газета | 1 | - | - |
| Свободные новости | 9 | 15 | 6 |
| Семейный очаг | - | - | 1 |
| Семь дней | 14 | 14 | 11 |
| Сов.Белоруссия | 39 | 53 | 64 |
| Спортивная панорама | - | 1 | - |
| Сямья | 10 | 7 | - |
| Тайна души | - | 1 | - |
| Театральная газета | - | 1 | - |
| Товарищ | 1 | 1 | 1 |
| Транспортный вестни | 2 | 2 | - |
| Труд | - | - | 7 |
| Трудовой путь | - | 4 | - |
| Туризм и отдых | 5 | 4 | 1 |
| Тыднёвік магілёўскі | - | 1 | - |
| Царкоўнае слова | 3 | 2 | 2 |
| Цэнтральная газета | 14 | 3 | - |
| Частная собственность | 3 | 1 | 2 |
| Чистый мир | 2 | 1 | 2 |
| Чырвоная змена | 41 | 28 | - |
| Энергетика Беларуси | - | - | 1 |
| Эхо | - | - | 1 |
| Усяго | 101/1417 | 101/1470 | 92/1367 |

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

**_Табліца № 4._**

*Размеркаванне газетных артыкулаў музычнай тэматыкі па месяцах*

| Год | | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вучэбныя выданні | Вуч.праграмы, стандарты | 5 | 11 | 9 | 14 | 11 | 50 |
| | Вуч.-метад. дапам., хрэстам | 1 | 2 | 3 | - | 4 | 10 |
| Навуковыя выданні (манаграфіі) | | 1 | 2 | - | 1 | - | 4 |
| Матэрыялы канферэнцый (зборнікі) | Навукова-метадычныя | 1 | 1 | 2 | 1 | 2 | 7 |
| | Навуковыя | 1 | 1 | 1 | 3 | 1 | 7 |
| Перыядычныя выданні | Веснік БДУ культуры і мастацтваў | - | 1 | 1 | 1 | 2 | 5 |

*Заўвага: Агульная колькасць артыкулаў за год у табл. № 3 не адпавядае аналагічнаму паказчыку ў табл. № 4 па той прычыне, што складальнікі летапісаў да часопісных і газетных артыкулаў часам адносілі артыкулы, прадстаўленыя ў зборніках і кнігах. Мы такія артыкулы ў табліцы № 3 не ўлічвалі, але ў табл. 4 прадставілі агульную колькасць улічаных аўтарамі летапісу артыкулаў.

**_Табліца № 5._**

*Дакументны паток музычна-адукацыйнай тэматыкі, апрацаваны рэдакцыйна-выдавецкім аддзелам БДУ культуры і мастацтваў (2001–2005 гг.)*

| Год | | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вучэбныя выданні | Вуч.праграмы, стандарты | 5 | 11 | 9 | 14 | 11 | 50 |
| | Вуч.-метад. дапам., хрэстам | 1 | 2 | 3 | - | 4 | 10 |
| Навуковыя выданні (манаграфіі) | | 1 | 2 | - | 1 | - | 4 |
| Матэрыялы канферэнцый (зборнікі) | Навукова-метадычныя | 1 | 1 | 2 | 1 | 2 | 7 |
| | Навуковыя | 1 | 1 | 1 | 3 | 1 | 7 |
| Перыядычныя выданні | Веснік БДУ культуры і мастацтваў | - | 1 | 1 | 1 | 2 | 5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Теоретические основы процесса обучения в советской школе / [В.В. Краевский, И.Я. Лернер, И.К. Журавлев и др.]. – М. : Педагогика, 1989. – С. 187. – (Образование. Пед. науки. Общ. педагогика).
2. Тамсама, с. 189.
3. Проблемы школьного учебника. Вып. 1–14. – М. : Просвещение, 1973–1984.

# ТРАДЫЦЫЙНЫ КАЛЯНДАР БЕЛАРУСАЎ: ГІСТАРЫЧНЫ ВОПЫТ І ПЕРСПЕКТЫВЫ АКТУАЛІЗАЦЫІ

## (ДА ВЫДАННЯ СЕРЫІ "БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР")

***Катовіч Аксана Веніямінаўна,*** *магістр педагагічных навук, выкладчык кафедры этналогіі і фальклору;*
***Крук Іван Іванавіч,*** *кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Гісторыя збірання твораў беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі і вывучэння ўсіх складнікаў міфарытуальных комплексаў налічвае больш за два стагоддзі. У той ці іншай ступені да гэтай праблемы мелі дачыненне ўсе знакамітыя і вядомыя толькі па адзінкавых публікацыях збіральнікі вусна-паэтычнай спадчыны беларускага народа. Дастаткова назваць прозвішчы М. Чарноўскай, З. Даленгі-Хадакоўскага, К. Фалютынскага, А. Мухлінскага, Я. Баршчэўскага, Л. Галэмбёўскага, Р. Зянькевіча, П. Шпілеўскага, П. Бяссонава, П. Шэйна, Е. Раманава, А. Шлюбскага, М. Дзмітрыева, І. Бермана, І. Насовіча, Ю. Крачкоўскага, З. Радчанка, М. Янчука, Я. Карскага. Пачынаючы з 70-х гг. XX ст. беларускі земляробчы каляндар становіцца аб'ектам больш дэталёвага навуковага даследавання. Аднак такія навукоўцы, як А.І. Гурскі, А.С. Ліс, Г.А. Барташэвіч, А.С. Фядосік, Л.М. Салавей займаюцца даследаваннем асобных фальклорных жанраў, тэматычна звязаных з цыкламі каляндарна-абрадавай паэзіі: зімовай, веснавой, летняй і восеньскай. На пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя даследчыкі А.Ю. Лозка, У.А. Васілевіч, В.Дз. Ліцьвінка, В.С. Новак зрабілі першыя спробы абагульніць назапашаныя матэрыялы і прааналізаваць асноўныя святочна-абрадавыя комплексы традыцыйнага земляробчага календара беларусаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ